**Прысвячэнне.** Выстаўка «Прывесці ў рух энергію сумлення...», прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча, адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы. Літаратурная спадчына прадстаўлена зборам твораў у 23 тамах, кнігамі выбраных твораў, зборнікамі лірыкі, раманам у вершах «Родныя дзеці», паэмай «Сказ пра Лысую гару», зборнікам п'ес «Начлег на буслянцы», аўтабіяграфічнай аповесцю «Перажыўшы вайну», зборнікамі літаратурна-крытычных і публіцыстычных артыкулаў, кнігамі сатыры і гумару, творамі для дзяцей, паведамілі ў НББ. Раздзел «Звонкае сэрца паэта» знаёміць гасцей з творамі аўтара на балгарскай, польскай, рускай, англійскай, іспанскай і іншых мовах, а таксама з яго перакладчыцкай дзейнасцю. На словы паэта пісалі музыку многія беларускія кампазітары, пра што можна даведацца ў раздзеле «Песенная панарама».